### Галоўны сімвал багацця, жыцця ў дастатку ў беларускай фразеалогіі

У працяг знаёмства з беларускім фразеалагізмам *вароты пірагамі падпёрты* і «прачытання» яго культурнай інфармацыі пазнаёмімся з іншымі беларускімі фразеалагізмамі, што аб'яднаны агульным значэннем 'жыць у дастатку, багата, без турбот і клопату', тым самым выявім народныя сімвалы багацця, дастатку і задавальнення. Да такіх адносяцца фразеалагізмы, што прадстаўляюць гастранамічны код культуры беларусаў, які складаюць тыя найменні прадуктаў харчавання, страў, іх прыгатавання, якасцяў і інш., што надзелены дадатковымі сэнсамі культуры і абраны як кампаненты і аснова вобразаў пры ўтварэнні фразеалагічных адзінак, якія пачынаюць выконваць функцыю сімвалаў, эталонаў, стэрэатыпаў.

З ліку шматлікіх трафонімаў (ад гр. *trophe* = ежа, жыўленне), якім, акрамя наймення пэўнага прадукту, уласціва сімволіка 'багацце', 'дастатак', абраны толькі асобныя, і яны з далёкага мінулага адлюстроўваюць уяўленні беларусаў пра багатае жыццё, пра тую важную ролю ежы, без якой чалавек не можа жыць, з якой звязваюць увогуле пераход ад прыроды да культуры і якая стала адной з характарыстык жыцця чалавека. Гэта найперш лексема *хлеб*, якая самая частотная ў складзе трафонімных фразеалагізмаў, што тлумачыцца не толькі тым, што гэтае слова выступае найменнем асноўнага прадукту харчавання чалавека, але і тым, што яно называе найбольш сакралізаваны від ежы. Нашы продкі хлеб абагаўлялі, да яго адносіліся як да жывой істоты, хлеб выступае сімвалам жыцця, долі чалавека, з'яўляецца адным з самых важных паняццяў у культуры беларусаў, у тым ліку сімвалам багацця. І гэта адлюстравана ў фразеалагізмах *вароты хлебам адкрываць* і *есці хлеб поўным ротам*, якія маюць агульнае значэнне – 'багата, заможна жыць', але іх розныя вобразы даводзяць розныя сэнсавыя адценні, ацэнку.

Першы фразеалагізм пабудаваны на аснове нерэальнага вобраза з выкарыстаннем гіпербалічнага прыёму: хлеба так многа, што хлебам вароты адкрываюць. Хоць можна гэта разумець і па-іншаму: хлеба ў кагосьці многа, ім сустракаюць кожнага, ім дзеляцца. Тут важную ролю адыгрывае дзеяслоўны кампанент *адкрываць* – зрабіць даступным, пусціць на сваю тэрыторыю (вароты як сімвал мяжы сваёй тэрыторы), даць увайсці каму-небудзь, бо тут вароты адкрываюць хлебам – гэта магчымасць вобразна перадаць інфармацыю не толькі пра багацце, дастатак, а яшчэ і гасціннасць, адкрытасць. І фразеалагізм перадае стэрэатыпнае ўяўленне беларусаў пра заможнае жыццё чалавека, які жыве багата і можа падзяліцца, рады сустрэць хлебам-соллю.

А вось фразеалагізм *есці хлеб поўным ротам* заснаваны на аснове метафарызацыі наймення рэальнага дзеяння і выступае рэпрэзентантам гастранамічнага коду адразу праз два кампаненты: *хлеб* як найменне прадукту харчавання і *есці* як найменне аднаго з працэсаў ужывання ежы чалавекам. Праўда, фразеалагізм суадносіцца яшчэ і з саматычным кодам праз кампанент *рот*, без якога ўжыванне хлеба немагчыма ўявіць. А вось атрыбутыўны кампанент *поўным* служыць сродкам вымярэння і вызначае высокі ўзровень дастатку, багацця-хлеба (*поўны* – які змясціў у сабе ці ўмясціў у сябе найбольшую магчымую колькасць чаго-небудзь), але ў спалучэнні з назоўнікам *рот* ілюструе спосаб ужывання – *поўным ротам*. А гэта ўжо нядобра, неэтычна, таму фразеалагізм паведамляе пра багатае жыццё каго-небудзь, якое не выклікае захаплення і якое ацэньваецца з доляй іроніі і насмешкі.

*Вольга Ляшчынская*

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт (Беларусь)*

*e-mail: zshvedova@mail.ru*

*DOI: 10.32612/uw.bmz.2021.5.pp.44*